Прадугледжвае ўзгодненасць элементаў, якая вызначае структурнае і маст. адзінства, што выражаецца ў гармоніі. Для маст.-вобразнага ўзбагачэння выкарыстоўваецца дызайн асяроддзя, які ўключае *архітэктуру малых форм*, элементы добраўпарадкавання, азеляненне, творы манумент.-дэкар. мастацтва.

Гістарычнае А.а. Беларусі прадстаўлена помнікамі архітэктуры і будаўніцтва з перыяду позняга палеаліту (Юравічы, Бердыж) да 1960-х гг. (жылыя і грамадскія будынкі, культавыя, прам. пабудовы, архіт. комплексы і ансамблі). Сучаснае А.а. фарміруюць будынкі і збудаванні гарадоў, пасёлкаў, вёсак, аграгарадкоў, а таксама аб'екты камунікацый (дарогі, масты, шляхаправоды, станцыі метрапалітэна і інш.), элементы ландшафтнай архітэктуры і архітэктуры малых форм 1960—2000-х гг. Сельскае А.а. аб'ядноўвае прам. і сялібную зоны; гар. мае размежаванне прасторы на жылую (раёны індывід. забудовы, жылыя раёны, мікрараёны, пасёлкі), прам. (прам. зоны і тэрыторыі), дзелавую (агульнагар., дзелавыя і офісныя цэнтры), рэкрэацыйную (адкрытыя ландшафтныя тэр., паркі, бульвары) зоны. У Беларусі А.а. сінтэзуе стылявыя рысы неарацыяналізму, постмадэрнізму, дэканструктывізму, хай-тэку. Улік кантэксту А.а. з'яўляецца неабходнай умовай сучаснага праектавання і будаўніцтва. *Ю.Ю.Захарына.*

**АСЯРО́ДДЗЕ АРХІТЭКТУ́РНАЕ**, матэрыяльна арганізаваная, упарадкаваная прастора жыццядзейнасці чалавека ў непадзельным адзінстве функцыянальных, тэхн. і эмацыянальна-эстэтычных характарыстык, выражаных гал. чынам сродкамі кампазіцыі, прапорцый, маштабу, рытму, тэктонікі аб'ёмаў, канструкцыі і дэкору. А.а. мае градацыю па ўзроўні пераўтварэнняў (горадабуд. і архіт.-ландшафтнае), характары забудовы (сельскае і гар.), часавых (гіст. і сучаснае) і прасторавых (адкрытае і замкнёнае) характарыстыках, функцыянальных якасцях (прам., жыллёвае).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ